Дзень цвярозасці

З кастрычніка у рамках Сусветнага Дня цвярозасці і барацьбы з алкагалізмам, які міжнародная грамадскасць адзначае, на пляцоўцы перад Нясвіжскім раённым цэнтрам культуры прайшло мерапрыемства
“Мы — за здаровую Беларусь!”.
Асноўнай аўдыторыяй, на якую яно было накіравана, стала моладзь, а менавіта навучэнцы Нясвіжскага дзяржаўнага каледжа імя Якуба Коласа. Разам з работнікамі культуры маладыя людзі прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемства. Яны сталі ўдзельнікамі валанцёрскага руху “Культура — з добрым сэрцам”, які пачаў сваю работу з уручэння жыхарам горада флаераў з інфармацыяй аб Дні цвярозасці, а таксама падрыхтавалі захапляльны флэшмоб па тэме мерапрыемства — “Мы — за здаровую Беларусь!”.
На агляд прысутных былі таксама прапанаваны выстава плакатаў, якія прапагандуюць шкоду алкаголя, выстава малюнкаў “Здаровая Беларусь”, канцэртная праграма “Разам!”. Асаблівую ўвагу ўсіх, хто ў той дзень змог стаць сведкам разгорнутай на свежым паветры дзеі, стала выступленне настаяцеля прыхода праведнай Ганны аг. Аношкі і Мікольскага прыхода аг. Грыцкевічы нашага раёна, іерэя Васіля Краева.